Нр 3236

СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

ПРАЧЫТАЎ—ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

# БЮЛЕТЭНЬ

## ГАЗЕТЫ „ПАРТЫЗАН БЕЛАРУСІ"

Бібліятэка АН БССР

ОРГАН МІНСКАГА АБКОМА КП(б)БЕЛАРУСІ

№ 25 Люты 1943 год

ПРАКЛЯЦЦЕ І СМЕРЦЬ НЯМЕЦКА—ФАШЫСЦКІМ ЗАХОПНІКАМ, ІХ ДЗЯРЖАВЕ, ІХ АРМІІ, ІХ „НОВАМУ ПАРАДКУ Ў ЕЎРОПЕ"!

(З лозунгаў ЦКВКП(б) да 25-ай гадавіны Чырвонай Арміі).

## ВЫКАНАЕМ ЗАГАД ТАВАРЫША СТАЛІНА.

Загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага таварыша Сталіна ў дзень 25-ай гадавіны Чырвонай Арміі совецкі народ сустрэў з вялікай радасцю.

За 20 месяцаў Чырвоная Армія правяла нябывалую яшчэ ў гісторыі гераічную барацьбу, вывела са строю да 9 мільёнаў варожых салдат і афіцэраў, з якіх—ня менш 4 мільёнаў забітымі. Поўнасцю разгромлены румынская, італьянская і венгерская арміі, кінутыя Гітлерам на Совецка—германскі фронт.

Толькі за апошнія 3 месяцы паспяховага наступлення па фронту ў 1500 кілометраў, разбіта 112 дывізій праціўніка і вызвалена ад ворага тысячы вёсак і гарадоў, у тым ліку: Растоў, Харкаў, Курск, Сумы, Вялікія Лукі і іньш.

Немцы страцілі больш 7000 танкаў, 4000 самалётаў, 17000 гармат і многа іншага ўзбраення.

„Пачалося масавае выгнанне ворага з Совецкай Краіны" (Сталін).

Усё гэта сведчыць аб тым што змяніліся суадносіны сіл на Совецка-германскім фронце.

Вораг пацярпеў паражэнне і будзе канчаткова разгромлен, але ён яшчэ не раможан і глупа было-б палагаць, папярэджвае тав. Сталін, што немцы пакінуць бяз бою хаця-б кілометр нашай зямлі. Яшчэ прадстаіць суровая барацьба супроць каварнага ворага. Не павінна быць ні малейшай супакоенасці ў нашых шэрагах. Усе сілы на разгром ворага!

Таварыш Сталін загадаў:

„1. Неустанна саваршэнстваваць баявую вывучку і ўмацоўваць дысцыпліну, парадак і арганізаванасць ва ўсёй Чырвонай Арміі і ў Ваенна — Морскім Флоце.



2. Узмацніць удары па варожых войсках, неустанна і ўперта праследаваць ворага, не даваць яму замацоўвацца на абаранітельных рубяжах, не даваць яму адпачынку ні днём, ні ноччу, рэзаць камунікацыі ворага, акружаць варожыя войскі і знішчаць іх, калі яны адмаўляюцца скласці зброю.

3. Шырэй раздуць полымя партызанскай барацьбы ў тылу ворага, разбурваць камунікацыі ворага, узрываць чыгуначныя масты, зрываць перакідку непрыяцельскіх войск, падвоз зброі і боеприпасаў, узрываць і падпальваць воінскія склады, нападаць на непрыяцельскія гарнізоны, не даваць адступаючаму ворагу спальваць нашы сёлы і гарады, дапамагаць усімі сіламі, усімі сродкамі наступаючай Чырвонай Арміі.

У гэтым залог нашай перамогі."

Пад сцягам Леніна, пад вадзіцельствам Сталіна—уперад, за разгром нямецка-фашысцкіх акупантаў і выгнанне іх з прэдзелаў нашай Радзімы!

## Партызанскі рахунак

За два месяцы баявых дзеянняў партызаны атрада тав. І. пусцілі пад адкос 13 эшалонаў з войскамі і баявой тэхнікай нямецка-фашысцкіх акупантаў.

У выніку—19 паравозаў паляцелі пад адкос, а 220 вагонаў ператварыліся ў абломкі. 1500 гітлераўцаў знайшлі сабе магілу пад абломкамі вагонаў, харчаванне і фураж, які фашысты накіроўвалі да лініі фронта, прыведзены ў нягоднасць. Два эшалоны з танкамі, аўтамашынамі і матар'яламі народныя помстнікі поўнасцю спалілі.

***

Партызаны атрада, які дзейнічае ў адным з раёнаў Мінскай області, у студзені месяцы пусцілі пад адкос 11 воінскіх эшалонаў праціўніка. Разбіта 8 паравозаў і 129 вагонаў.

У баях супроць нямецкіх акупантаў совецкія патрыёты захапілі 6 гармат, 25 кулямётаў, 18 аўтаматаў, 296 вінтовак і 50.000 патронаў. Адбіта ў немцаў 3436 галоў буйнай рагатай жывёлы і каля 2000 тон збожжа, нарыхтаванага немцамі для адпраўкі ў Германію.

***

Партызаны другога атрада, ў баях з нямецкімі захопнікамі, разграмілі гарнізон праціўніка, раённую паліцэйскую ўправу, спалілі лесазавод, пякарню, 3 збожжавых склады і сена—склад.

Партызаны знішчылі мост праз раку Б. і ўзарвалі 7 мастоў на шасэйных дарогах.

За час правядзення гэтых баявых аперацый партызанамі знішчана больш 50 немцаў.

жр 3236



# На франтах Айчыннай вайны

(З ПАВЕДАМЛЕННЯЎ СОВІНФОРМБЮРО ад 26 і 27 лютага)

На працягу 27-га лютага нашы войскі вялі наступальныя баі на ранейшых напрамках.

Нашымі караблямі ў Барэнцавым моры патоплен мінаносец праціўніка.

25 і 26 лютага часцямі нашай авіяцыі на разлічных участках фронта знішчана альбо папсавана да 300 аўтамашын з войскамі і грузамі, 10 нямецкіх танкаў, падаўлен агонь 10 артылерыйскіх батарэй, узарвана 2 склады боепрыпасаў і разбіт чыгуначны эшалон праціўніка.

***

На паўднёвы захад ад Краматорская нашы войскі вялі жорсткія баі з танкамі і матапяхотай праціўніка. Совецкія байцы знішчылі да 1400 гітлераўцаў. Агнём нашай артылерыі і бронебойшчыкаў, а так сама супроцьтанкавымі гранатамі знішчана і падпалена 50 танкаў і 52 аўтамашыны. Совецкія лётчыкі ў паветраных баях збілі 15 нямецкіх самалётаў.

***

На захад ад Харкава нашы войскі працягвалі наступленне і занялі рад насялёных пунктаў. У баях за гэтыя насялёныя пункты праціўнік панёс вялікія страты. Толькі на двух участках нашы байцы знішчылі да 350 гітлераўцаў, падбілі і спалілі 6 танкаў. Совецкія байцы захапілі 10 гармат (з іх 2 самаходных), 20 кулямётаў, многа вінтовак, 3 склады з боепрыпасамі, 2 з харчаваннем і гаручым, 19 трактараў і іншыя трафеі. Нашай авіяцыяй на аэрадромах праціўніка ў Запарожжы знішчана і спалена 18 нямецкіх бомбардыроўшчыкаў.

***

26 лютага нашы часці на захад ад Курска вялі наступальныя аперацыі і занялі 4 насялёных пункты.

27 лютага на поўнач ад Курска часці Н-скага злучэння прасунуліся на перад і занялі некалькі насялёных пунктаў.

***

На Кубані нашы войскі працягвалі наступленне. У баях у раёне аднаго насялёнага пункта совецкія падраздзяленні захапілі 17 гармат, 11 аўтамашын, склад з мінамі і 100.000 патронаў

***

На захад ад Обоянь нашы часці ліквідавалі акружаную групу праціўніка. Узята ў палон 400 нямецкіх салдат і афіцэраў.

(Прынята па радыё).

## ПОМСТА

Да вайны ён працаваў у Мінску ў якасці возчыка. Працаваў чэсна і ня дрэнна жыў. Але здарылася другое.

Гітлераўская Германія вераломна, па зладзейскі напала на нашу Радзіму. Фашысцкае звяр'ё разгарнула масавыя здзекі, гвалт і забойствы тысяч працоўных Мінска.

Сэрца Рамана загарэлася помстай. Беларускі лес прыняў яго ласкава. У партызанскім атрадзе Раман замяніў каня на кулямёт, каб адпомсціць ворагу за яго зладзеянні.

Не траціць ні аднаго патрона дарэмна, гэта зрабіў для сябе не парушным правілам кулямётчык.

Больш 20 фашысцкіх мярзотнікаў забіты Раманам за час знаходжання ў атрадзе — вось яго рахунак. 3 фашысты ён забіў прыкладам у рукапашнай схватцы ў вёсцы О.

Р—кі.

## Партызанскі падарунак Радзіме

Набліжалася вялікае свята працоўных Совецкага Саюза. Я і мае таварышы захапіліся адною думкаю — адзначыць свята падарункам нашай слаўнай Радзіме. Наша думка стала вядома камандаванню атрада. Мы атрымалі баявое заданне — не дапусціць на лінію фронта фашысцкі эшалон з танкамі і аўтамашынамі.

Дзейнічаць патрэбна было наверняка. З захапленнем мы пачалі ўсебакова і грунтоўна рыхтаваць аперацыю. Месцам узрыва мы выбралі кропку ў раёне вёскі Б. (Мінская вобласць) дзе шлях перасякае вадаправодная труба. Тут мы старанна і замініравалі чыгуначны шлях.

Раздаўся агромны ўзрыў. Паравоз і 6 вагонаў гружаныя, як і ўвесь эшалон, танкамі і аўтамашынамі, ператварыліся ў абломкі. Але гэта для нас было недастаткова. Астатнія вагоны мы спачатку абстралялі, а потым закідалі бутэлькамі з бензінам і падпалілі. У выніку ўвесь эшалон з баявой тэхнікай фашыстаў згарэў.

Партызан Юзік.

# За граніцай

Прэзідэнт ЗША Рузвельт у тэлеграме на імя старшыні СНК СССР таварыша Сталіна па случаю 25 гадавіны Чырвонай Арміі даў высокую ацэнку яе баявых поспехаў.

У Англіі ўрачыста адзначалася 25 гадавіна Чырвонай Арміі. Ва ўсіх буйных гарадах адбыліся мітынгі, скліканыя па спецыяльнаму рашэнню англійскага ўраду.

У Лондане адкрылася выстаўка „25 гадоў СССР і Чырвонай Арміі".

26 лютага англійскія самалёты бамбардыравалі горад Нюрнберг. Акрамя таго, быў зроблен налёт на розныя аб,екты ў Заходняй Германіі.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ.